**Тэставыя заданні па дысцыпліне “Тэорыя і методыка музейнай справы”, спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)**

***Тэст № 1***

1. Музеі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – гэта ўстановы, якія __________

2. Атрыбуцыя – гэта:

А) выяўленне асноўных прызнакаў музейнага прадмета

Б) занясенне дадзеных аб музейным прадмеце ў інвентарную кнігу

В) дацiроўка музейнага прадмета

Г) падрыхтоўка да прадстаўлення музейнага прадмета ў каталоге

3. Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Дом-музей Ф. Багушэвіча |
| 2. Гістарычны | Б. Музей-сядзіба Міцкевічаў |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Музей М. Гарэцкага |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры |
| 5. Літаратурны | Д. Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны |
| 6. Мастацкі | Е. Заалагічны музей БДУ |

4. Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Акт на пагашэння старых кніг уліку |
| Б) экспазіцыйная | 2. Аўтагід |
| В) асветніцкая | 3. Анатацыя |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Тэматычны план. Б. Навуковая канцэпцыя. В. Тэматыка-экспазіцыйны план.

**Тэст № 2**

1. Краязнаўчыя музеі – гэта ўстановы ____________________

2. Музеялогія – гэта:

А) навука аб музеях

Б) навуковая і вучэбная дычцыпліна, вывучаючая музейную дзейнасць

В) навуковая і вучэбная дычцыпліна аб каштоўнасных адносінах чалавека да рэчаіснасці

Г) навука, якая вывучае гісторыю, тэорыю і методыку музейнай справы

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Курган Славы |
| 2. Гістарычны | Б. Хата-музей П. Броўкі |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Дзяржаўны музей Я. Коласа |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Беларускі музей архітэктуры і побыту. |
| 5. Літаратурны | Д. Музей валуноў НАН |
| 6. Мастацкі | Е. Чачэрскі гісторыка-этнаграфічны музей |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Атрактыўнасць музейнага прадмета |
| Б) экспазіцыйная | 2. Акт унутранай перадачы |
| В) асветніцкая | 3. Клуб музейны |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:
А. Мантажныя аркушы (шаблоны). Б. Мастацкая канцэпцыя (макет). В. Эскізны праект.

**Тэст № 3**

1. Музеі народнай творчасці – гэта ўстановы ______________________________

2. Музейны прадмет – гэта:

А) прадмет, страціўшы утылітарныя якасці і маючы цікавасць для навуковага і культурнага выкарыстання

Б) помнік гісторыі і культуры, выключаны з утылітарнага ўжытку і перададзены ў склад музейнага збору

В) прадмет, які выступае ў якасці першакрыніц ведаў аб прыродзе і грамадстве

Г) прадмет, які ўяўляе каштоўнасць для выкарыстання ў музейнай экспазіцыі

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Музей М. Багдановіча |
| 2. Гістарычны | Б. Сядзіба М.К. Агінскага ў Залессі |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Мемарыяльны комплекс “Хатынь” |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Геалагічны музей БДУ |
| 5. Літаратурны | Д. Хойніцкі гісторыка-краязнаўчы музей |
| 6. Мастацкі | Е. Музей старажытнабеларускай культуры НАН |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Кніка водгукаў |
| Б) экспазіцыйная | 2. Аўдыёвізуальныя сродкі |
| В) асветніцкая | 3. Акт дэфектны |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Размяшчэнне музейных прадметаў у экспазіцыйным абсталяванні. Б. Падрыхтоўка музейных прадметаў да транспарціроукі. В. Чыстка і рэстаўрацыя музейных прадметаў.

**Тэст № 4**

1. Музеі-ансамблі – гэта ўстановы ________________________________________

2. Шыфр музея – гэта:

А) скарочаная назва музея для ўліку ў Міністэрстве культуры

Б) скарочаная назва музея для спасылак на яго калекцыі ў навуковых працах

В) скарочаная назва музея для спрашчэння справаводства ў дадзеным музеі

Г) скарочаная назва музея, якая наносіцца на кожную адзінку захоўвання

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Музей Ст. Манюшкі ва Убелі |
| 2. Гістарычны | Б. Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Мемарыяльны музей І. Мележа |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Музей гісторыі Беларускай ваеннай акругі |
| 5. Літаратурны | Д. Мядзельскі музей народнай славы |
| 6. Мастацкі | Е. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Акт прыёма |
| Б) экспазіцыйная | 2. Маршрут |
| В) асветніцкая | 3. Біягрупа |

5.Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Напісанне канцэпцыі музея. Б. Аналіз сацыякультурнай сітуацыі ў рэгіёне. В. Аналіз музейнай сеткі ў рэгіёне.

**Тэст № 5**

1. Музеі прыроды – гэта ўстановы ____________________________________

2. Фумігацыя – гэта:

А) знішчэнне парамі і газамі шкоднікаў і мікрафлоры, якая сапсуе прадметы калекцый

Б) генеральная прыборка фондасховішча

В) апрацоўка хімічнымі прэпаратамі музейных прадметаў, вырабленых са скуры, паперы і тканіны

Г) пазбаўленне ад іржы прадметаў з жалеза ў кіслотных ваннах

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Музей М. Гарэцкага |
| 2. Гістарычны | Б. Светлагорская галерэя “Традыцыя” імя Г. Пранішнікава |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Тураўскі краязнаўчы музей |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Музей гісторыі войск МВД |
| 5. Літаратурны | Д. Музей гісторы медыцыны |
| 6. Мастацкі | Е. Музей Алімпійскага руху |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Вітрына |
| Б) экспазіцыйная | 2. Акт сверкі |
| В) асветніцкая | 3. Педагогіка музейная |

.

5.Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Напісанне навуковай справаздачы. Б. Перадача матэрыялаў у аддзел фондаў. В. Складанне плана правялзення экспедыцыі. Г. Складанне палявой дакументацыі.

.

**Тэст № 6**

1. Музей-кватэра – гэта ўстанова ——————————————————————

2. Фотатэка музея – гэта:

А) даведачная картатэка, дзе знаходзяцца фотавыявы ўсіх музейных прадметаў

Б) складаная частка фондаў музея, якая ўключае негатывы і навукова-даведачны аппарат да яго

В) складаная частка фондаў, якая ўключае ўсе фотакарткі, што маюцца ў музеі

Г) фотаздымкі і негатывы, якія адлюстроўваюць развіццё дадзенага музея як навукова-асветнай установы

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Дзяржаўны музей Я. Купалы |
| 2. Гістарычны | Б. Музей прыроды і экалогіі РБ |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Музей сучаснага выяўленчага мастацтва |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей |
| 5. Літаратурны | Д. Музей гісторыі Беларускай чыгункі ў Баранавічах |
| 6. Мастацкі | Е. Слуцкі краязнаўчы музей |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Наведванне музея |
| Б) экспазіцыйная | 2. Выстава |
| В) асветніцкая | 3. Атрыбуцыя |

5.Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Размяшчэнне эцікетажу. Б. Размяшчэнне музейных прадметаў і навукова-дапаможны матэрыялаў. В. Пабудова экспазіцыйнага каркасу.

**Тэст № 7**

1. Музей-панарама – гэта ўстанова ______________________________________

2. Фонакрыніцы не ўключаюць:

А) воскавыя валікі

Б) пласцінкі

В) магнітныя ленты

Г) сценаграммы выступленняў

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Нацыянальны мастацкі музей РБ |
| 2. Гістарычны | Б. Ашмянскі музей імя Ф. |

| | |
|---|---|
| | Багушэвіча |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Ваўкавыскі музей імя П.І. Баграціёна |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Музей М. Багдановіча |
| 5. Літаратурны | Д. Дом-музей А. Міцкевіча |
| 6. Мастацкі | Е. Музей запаведніка “Белавежская пушча” |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Часовае захаванне |
| Б) экспазіцыйная | 2. Псіхалагічны эксперымент |
| В) асветніцкая | 3. Генеральнае рашэнне |

5.Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы. Распрацоўка:

А. Сістэмы арыентацый. Б. Асвятлення. В. Экспазіцыйнага вобразу. Г. Экспазіцыйнага абсталявання. Д. Прасторавага і каляровага рашэння.

**Тэст № 8**

1. Музей пад адкрытым небам – гэта ўстанова ______________________

2.Філіял музея – гэта:

А) самастойная ў навуковых адносінах адзінка, якая залежыць ад фінансавання галаўнога музея

Б) тэрытарыяльна адасобленае аддзяленне музея, якое мае самастойнае грамадскае і навуковае значэнне

В) музей на грамадскіх пачатках, якому аказваецца метадычная дапамога з боку дзяржаўнага

Г) ведамасны музей, які абавязаны перадаваць на захаванне ў галаўны музей найбольш каштоўныя прадметы

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Карыліцкі музей “Зямля і людзі” |
| 2. Гістарычны | Б. Музей Бярэзінскага біясфернага запаведніка |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Архітэктурны комплекс у в. Гальшаны |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Мастоўскі музей “Лес і чалавек” |
| 5. Літаратурны | Д. Валожынскі раённы музей |
| 6. Мастацкі | Е. Мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой” |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Галаграма |
| Б) экспазіцыйная | 2. Галоўны захавальнік |
| В) асветніцкая | 3. Сацыялагічны апрос |

.

5.Размясціце ў паслядоўнасці службовага падпарадкавання наступныя пасады:

А. Загадчык філіяла. Б. Малодшы навуковы супрацоўнік. В. Старэйшы навуковы супрацоўнік. Г. Галоўны захавальнік. Д. Вядучы навуковы супрацоўнік. Е. Дырэктар. Ж. Навуковы супрацоўнік. З. Загадчык сектара. І.Намеснікі дырэктара. К. Загадчык аддзела.

**Тэст № 9**

1. Музей-сядзіба – гэта ўстанова ___________________________________________

2.Схаваны план – гэта:

А) частка экспазіцыі даступная для агляду толькі супрацоўнікамі музея

Б) прадметы, якія перахоўваюцца ў фондасховішчы

В) частка экспазіцыйных матэрыялаў, якая не выстаўлена для непасрэднага агляду і знаходзіцца ў турнікетах, касетных стэндах і г. д.

Г) музейныя прадметы і навукова-дапаможныя матэрыялы, якія змешчаны ў дыярамах

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Фальварк “Ракуцёўшчына” |
| 2. Гістарычны | Б. Дом-музей Ваньковічаў |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Музей п. Ільч Гомельскай вобл. |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Рэчыцкі краязнаўчы музей |
| 5. Літаратурны | Д. Мемарыяльны комплекс “Дальва” |
| 6. Мастацкі | Е. Мемарыяльная сядзіба “Альбуць” |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Тэматычнае мерапрыемства, напр, музейнае свята |
| Б) экспазіцыйная | 2. Дамінанта раздзела |
| В) асветніцкая | 3. Даціроўка |

5.Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Дэмантаж экспазіцыі. Б. Мантаж экспазіцыі. В. Вывучэнне літаратуры па экспазіцыйнай тэме.

**Тэст № 10**

1. Музычныя музеі – гэта ўстановы__________________________

2. Музейная сетка – гэта:

А) гістарычна склаўшаяся сукупнасць музеяў на пэўнай тэрыторыі

Б) музеі пэўнай профільнай групы, якія дзейнічаюць на дадзенай тэрыторыі

В) музеі пэўнай краіны, якія падпарадкоўваюцца аднаму кіруючаму органу

Г) сукупнасць музеяў, якія аб’ядноўваюцца па прынцыпу формы ўласнасці

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Музей “Беларуская хатка” |
| 2. Гістарычны | Б. Музей г. Светлагорска |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Мазырская карцінная галерэя |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей |
| 5. Літаратурны | Д. Музей Ф.Э. Дзяржынскага |
| 6. Мастацкі | Е. Нараўлянскі этнаграфічны музей |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Дублет |
| Б) экспазіцыйная | 2. Экскурсія вучэбная |
| В) асветніцкая | 3. Інтэр'ер |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Выпрацоўка маршрута экспедыцыі. Б. вызначэнне задач экспедыцыі. В. Фармулёўка навукова-даследчыцкай тэмы.

**Тэст № 11**

1. Народныя музеі – гэта ___________________________________________

2.Рэканструкцыя прадмета – гэта :

А) пазбаўленне прадмета ад канструкцыйных зменаў, зробленых у пазнейшыя эпохі

Б) узнаўленне незахаваўшагася ці часткова захаваўшагася прадмета на аснове навуковых дадзеных

В) пазбаўленне прадмета ад фізічных пашкоджанняў

Г) фотафіксацыя прадмета, падобнага на знікшы для экспазіцыйных мэтаў

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей |
| 2. Гістарычны | Б. Веткаўскі музей народнай творчасці |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Музей беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Музей бітвы за Дняпро |
| 5. Літаратурны | Д. Дом-музей дзеда Талаша |
| 6. Мастацкі | Е. Музей сувязі ў Мінску |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Тэматычны план |
| Б) экспазіцыйная | 2. Адзінка захоўвання |
| В) асветніцкая | 3. Экскурсія тэматычная |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Атрыбуцыя. Б. Класіфікацыя. В. Інтэрпрэтацыя

**Тэст № 12**

1. Грамадскія музеі – гэта ўстановы ___________________________________

2.“Раскрыццё” – гэта:

А) напісанне легенды музейнага прадмета

Б) падрыхтоўка пашпарта музейнага прадмета

В) рэстаўрацыйны прыём

Г) экскурсійны прыём

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Музей В.К. Бялыніцкага-Бярулі |
| 2. Гістарычны | Б. Гомельскі абласны краязнаўчы музей |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Мемарыяльны музей імя П.М. Лепяшынскага |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Жодзінскі дом-музей А.Ф. Купрыянавай |
| 5. Літаратурны | Д. Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе” |
| 6. Мастацкі | Е. Музей пажарнай аховы ў Мінску |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Экскурсія абзорная |
| Б) экспазіцыйная | 2. Тэматыка-экспазіцыйны план |
| В) асветніцкая | 3. Закупачная камісія |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Вывучэнне складу фондавых калекцый. Б. Выраб тэкстаў. В. Выраб навукова-дапаможных матэрыялаў.

**Тэст № 13**

1. Музей-запаведнік – гэта ________________________________________

2. Профіль музея – гэта:

А) статус, вызначаны ведамаснай прыналежнасцю

Б) напрамак дзейнасці, абумоўлены формай уласнасцю

В) катэгорыя, якая вызначаецца колькасцю адзінак захоўвання асноўнага фонду

Г) спецыялізацыя і дзейнасць музея, якая абумоўлена прыналежнасцю да канкрэтнай навуковай дысцыпліны

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Музей гісторыі Брэста |
| 2. Гістарычны | Б. Іканскі музей народнай славы |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Музей-майстэрня З.І. Азгура |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі |
| 5. Літаратурны | Д. Палаца-паркавы комплекс у Міры |
| 6. Мастацкі | Е. Магілёўскі абласны краязнаўчы музей |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Інвентарная картка |
| Б) экспазіцыйная | 2. Экскурсія метадычная |
| В) асветніцкая | 3. Мадэль |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы:

А. Захаванне. Б. Вучот. В. Камплектаванне.

**Тэст № 14**

1. Педагагічныя музеі – гэта ______________________________________________

2. Прэпаратар-таксідэрміст – гэта спецыяліст у галіне:
А) фізічнага захавання музейных калекцый

Б) забеспячэння захаванасці прадметаў у экспазіцыі

В) стварэння прыродазнаўчых музейных прэпаратаў

Г) рэстаўрацыі прыродазнаўчых калекцый

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Кобрынскі музей імя А.В. Суворава |
| 2. Гістарычны | Б. Дом музей I з’езда РСДРП |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Брэсцкі абласны краязнаўчы музей |

| | |
|---|---|
| 4.. Прыродазнаўчы | Г. Кацінная галерэя ў г.п. Акцябрскі. |
| 5. Літаратурны | Д. Барысаўскі дзяржаўны аб’яднаны музей |
| 6. Мастацкі | Е. Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік “Нясвіж” |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Ансамбль |
| Б) экспазіцыйная | 2. Вывучэнне музейнага прадмета |
| В) асветніцкая | 3. Экскурсія па-за музейная |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнага ўліку:

А. Рэгістрацыя. Б. Інвентарызацыя.

**Тэст № 15**

1. Музеі навукі і тэхнікі – гэта ўстановы ___________________________________

2. Новатвор – гэта:

А) адрэстаўраваны музейны прадмет

Б) дакладная копія, выкананая ў матэрыяле і памеры арыгінала

В) рэканструкцыя часткова захаваўшагася помніка матэрыяльнай культуры

Г) муляж, выкананы ў маштабе

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Археалагічны Музей “Бярэсце” |
| 2. Гістарычны | Б. Музей “Выратаваныя каштоўнасці” у Брэсце |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Помнік воінам-інтэрнацыяналістам у Мінску |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Баранавіцкі краязнаўчы музей |
| 5. Літаратурны | Д. Мемарыяльны комплекс “Мікалаеўшчына” |
| 6. Мастацкі | Е. Салігорскі краязнаўчы музей |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. методыка экскурсійнай работы |
| Б) экспазіцыйная | 2. Натюрморт музейны |
| В) асветніцкая | 3. Інвентарны номер |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы выраблення эцікетажа:

А. Размяшчэнне тэкстаў у экспазіцыі. Б. Вывучэнне калекцыйных вопісаў. В. Кампутарны набор.

**Тэст № 16**

1. Мастацкія музеі – гэта ______________________________________________

2. Музеяграфія – гэта галіна музейнай справы, якая:

А) займаецца апісаннем музеяў, іх экспазіцый і калекцый

Б) дае нарматывы вядзення фондавай дакументацыі

В) выпрацоўвае стандарты справаводства ў музеях

Г) распрацоўвае методыку складання экспазіцыйных тэкстаў

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Мастацкі музей у Віцебску |
| 2. Гістарычны | Б.Бярозаўскі гісторыка-краязнаўчы музей |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Музейны комплекс "Хаваншчына" |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Музей гісторыі Магілёва |
| 5. Літаратурны | Д. Мемарыяльная сядзіба "Смольня" |
| 6. Мастацкі | Е. Чэрвеньскі краязнаўчы музей |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Крыніца сістэматычнага камплектавання |
| Б) экспазіцыйная | 2. Адукацыйная сацыяльная функцыя |
| В) асветніцкая | 3. Падсветка |

.

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы напісання музейнага сцэнарыя:

А. Напісанне тэкста. Б. Фармаванне экспазіцыйнага замысла. В. Абмеркаванне на навукова-метадычным савеце.

**Тэст № 17**

1. Этнаграфічныя музеі – гэта ўстановы ___________________________________

2. Нацыянальны музейны фонд – гэта:

А) сукупнасць прадметаў, якія захоўваюцца ў музеях сістэмы Міністэрства культуры

Б) сукупнасць прадметаў асноўнага фонду ў дзяржаўных музеях краіны

В) сукупнасць належачых дзяржаве рухомых помнікаў гісторыі культуры, незалежна ад месца іх знаходжання

Г) сукупнасць музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў, якія захоўваюцца ў дзяржаўных і ведамасных музеях

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Чашніцкі гістарычны музей |
| 2. Гістарычны | Б. Музей Беларускага Палесся |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Музей-сядзіба “Пружанскі |

| | |
|---|---|
| | палацык” |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Магілёўскі абласны музей імя П.В. Масленнікава |
| 5. Літаратурны | Д. Музей савецка-польскай садружнасці ў в. Леніна |
| 6. Мастацкі | Е. Пухавіцкі краязнаўчы музей |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Подзіум |
| Б) экспазіцыйная | 2. Каталог музейны |
| В) асветніцкая | 3. Турызм |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы правядзення сацыялагічнага даследавання ў музее:

А. Складанне праграмы даследавання. Б. Фармулёўка гіпотэзы. В. Прызначэнне тэрмінаў.

**Тэст № 18**

1. Археалагічныя музеі – гэта ўстановы ___________________________________

2. Міжнародны дзень музеяў святкуецца:

А) 20 снежня

Б) 3 сакавіка

В) 16 лютага

Г) 18 мая

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Музей прыватных калекцый у Віцебску |
| 2. Гістарычны | Б. Музей М. Шагала |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Віцебскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Мемарыяльны музей І.П. Сікоры |
| 5. Літаратурны | Д. Бабруйскі краязнаўчы музей |
| 6. Мастацкі | Е. Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Тэтралізаваная экскурсія |
| Б) экспазіцыйная | 2. Пояс |
| В) асветніцкая | 3. Калекцыя музейная |

5. Размясціце па ступені значнасці наступныя сацыяльныя функцыі музеяў:

А. Рэкрэацыйная. Б. Дакументацыйная. В. Адукацыйна-асветніцкая.

**Тэст № 19**

1. Мемарыяльныя музеі – гэта ўстановы ___________________________________

2. Музейная справа – гэта:

А) базавая вучэбная дысцыпліна для будучых супрацоўнікаў музеяў

Б) навука, якая вывучае гісторыю і сучасны стан музеяў

В) галіна культуры, якая ўключае камплектаванне, улік, ахову і папулярызацыю музеямі культурнай спадчыны

Г) набор метадычны прыёмаў, які дапамагае палепшыць дзейнасць музеяў

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Міёрскі гісторыка-этнаграфічны музей |
| 2. Гістарычны | Б. Музейны комплекс “Гісторыя і культура Аршаншчыны” |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Дом-музей Пятра Алейнікава ў Шклове |
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей |
| 5. Літаратурны | Д. Беларускі музей ў Гайнаўцы (Польшча) |
| 6. Мастацкі | Е. Ушацкі музей народнай славы |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Камплектаванне |
| Б) экспазіцыйная | 2. Музейная культура |
| В) асветніцкая | 3. Праектаванне |

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы рэстаўрацыйнай работы. Складанне: А. Рэстаўрацыйнага пашпарта. Б. Дэфектнага акта. В. Акта прыёма.

**Тэст № 20**

1. Гістарычныя музеі – гэта ўстановы ____________________________________

2. Музейны прадмет – гэта:

А) помнік гісторыі і культуры, які знаходзіцца ў складзе музейнага збору

Б) помнік гісторыі і культуры, які прайшоў усе стадыі навуковай апрацоўкі і знаходіцца ў экспазіцыі

В) прадмет музейнага значэння, які мае патэнцыяльную вартасць для музеяў

Г) першакрыніца, якая выкарыстоўваецца ў даследаваннях спецыялістамі дапаможных гістарычных дысцыплін

3.Суаднясіце прыналежнасць канкрэтнай музейнай установы да профільнай групы:

| | |
|---|---|
| 1. Комплексны | А. Музей І.Я. Рэпіна ў Здраўнёва |
| 2. Гістарычны | Б. Беларускі музей імя Ф. Скарыны ў Лондане |
| 3. Ваенна-гістарычны | В. Чэрвеньскі раённы краязнаўчы музей |

| | |
|---|---|
| 4. Прыродазнаўчы | Г. Музей баявой садружнасці ў Расонах |
| 5. Літаратурны | Д. Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік |
| 6. Мастацкі | Е. Музей гісторыі і культуры Наваполацка |

4.Высвятліце адпаведнасць тэрмінаў напрамкам музейнай работы:

| | |
|---|---|
| А) фондавая | 1. Транспарціроўка музейных прадметаў |
| Б) экспазіцыйная | 2. Вопіс калекцыйная |
| В) асветніцкая | 3. Экскурс |

.

5. Размясціце ў паслядоўнасці наступныя этапы музейнай работы. Складанне:

А. Інвентарных кніг. Б. Картак навуковага апісання. В. Навуковых пашпартаў.

Тэст 1.

1. адлюстроўваюць у сваіх зборах развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і падзяляюцца на а) змяшчаючыя прадметы ўтылітарнага ўжытку (мэбля, посуд, адзенне, цацкі) і б) дэкаратыўнага характару (дэкаратыўная тканіны, роспіс, шыццё)
2. Правільны адказ – А

3. Правільны адказ: А – 5, Б – 5, В – 5, Г – 1, Д – 3, Е – 4.

4. Правільны адказ: А – 1, Б – 3, В – 2.

5. Прапвільны адказ: Б, А, В.

Тэст 2.

1. комплекснага профілю, якія сваёй дзейнасцю звязаны з некалькімі профільнымі дысцыплінамі, іх зборы дакуменціруюць гісторыю і прыроду канкрэтнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага рэгіёна .
2. Правільны адказ – В.
3. Правільны адказ: А – 3, Б – 5, В – 5, Г – 2, Д – 4, Е – 1.

4. Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 3.

5. Правільны адказ: Б, В, А.

Тэст 3.

1. Мастацкага профілю, зборы якіх характэрызуюць развіццё і сучасны стан народнага мастацтва, уключаюць усе віды матэрыяльнай культуры ад фрагментаў народнай архітэктуры да ювелірных вырабаў

2. Правільны адказ – Б

3. Правільны адказ: А – 5, Б – 1, В – 3, Г – 4, Д – 1, Е – 6.

4. Правільны адказ: А – 3, Б – 2, В – 1.

5. Правільны адказ: В, Б, А.

Тэст 4

1. асобага тыпу, створаныя на аснове захаваўшагася ці наноў створанага ансамбля помнікаў архітэктуры, інтэр’ераў, акалючай тэрыторыі
2. Правільны адказ – Г

3. Правільны адказ: А – 5, Б – 1, В – 5, Г – 3, Д – 1, Е – 2.

4. Правільны адказ: А – 1, Б – 3, В – 2.

5. Правільны адказ: В, Б, А.

Тэст 5.

1. прыродазнаўчага профілю, зборы якіх адлюстроўваюць прыроду канкрэтнага рэгіёна, яны ствараюцца ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных рэгіёнах, нацыянальных парках, курортна-турыстычных комплексах
2. Правільны адказ – А

3. Правільны адказ: А – 5, Б – 6, В – 1, Г – 3, Д – 2, Е – 2.

4. Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 3

5. Правільны адказ: В, Г, Б, А

Тэст 6.

1. якая размешчана ў кватэры, звязанай з выдатнай асобай, у якой захоўваецца ці аднаўляецца на дакументальнай аснове мемарыяльная абстаноўка
2. Правільны адказ – Б

3. Правільны адказ: А – 5, Б – 4, В – 6, Г – 1, Д – 2, Е – 1.

4. Правільны адказ: А – 3, Б – 2, В – 1.

5. Правільны адказ: В, Б, А

Тэст 7
1. створаная на аснове панарамы, г. зн. жывапіснай карціны, якая ахоплівае ўсё кола далягляду і аб'яднанай з пярэднім "прадметным" планам. Знаходзіцца ў круглай зале са сматравой пляцоўкай пасярэдзіне.
2. Правільны адказ – Г

3. Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 3, Г – 5, Д – 5, Е – 4.

4. Правільны адказ: А – 1, Б – 3, В – 2.

5. Правільны адказ: В, Д, Г, Б, А.

Тэст 8

1. гісторыка-архітэктурнага, этнаграфічнага ці комплекснага профілю, якая створана на аснове пабудоў (пераважна драўляных), звезеных з месц бытавання на спецыяльна адведзеную тэрыторыю

2. Правільны адказ – Б
3. Правільны адказ: А – 1, Б – 4, В – 6, Г – 1, Д – 1, Е – 3.

4. Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 3

5. Правільны адказ: Е, Г, І, А, К, З, Д, В, Ж, Б.

Тэст 9.

1. створаная на аснове сядзібнага ансамбля, якая ўключае жылыя і гаспадарчыя збудаванні, парк, сад і г. д. Мае мемарыяльнае ці гісторыка-мастацкае значэнне

2.Правільны адказ – В

3. Правільны адказ: А – 5, Б – 6, В – 2, Г – 1, Д – 3, Е – 4.
4. Правільны адказ: А – 3, Б – 2, В – 1.
5. Правільны адказ: Б, В, А.

Тэст10.

1. мастацтвазнаўчага профілю, зборы якіх дэманструюць развіццё музычнага мастацтва, калекцыі музычных інструментаў, матэрыялы, звязаныя з дзейнасцю выдатных кампазітараў і музыкантаў

2 Правільны адказ – А
3. Правільны адказ: А – 5, Б – 2, В – 6, Г – 1, Д – 2, Е – 2.
4. Правільны адказ: А – 1, Б – 3, В – 2.

5. Правільны адказ: В, Б, А.

Тэст11.

1. музеі, створаныя на грамадскіх пачатках, якім мясцовымі органамі кіравання прысвоена званне “народнага” на аснове спецыяльна распрацаваных крытэрыяў

2. Правільны адказ – Б

3.Правільны адказ: А – 1, Б – 2, В – 6, Г – 3, Д – 2, Е – 2.

4. Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 3.
5. Правільны адказ: А, Б, В.

Тэст12.

1. якія ствараюцца па ініцыятыве і непасрэдным удзеле грамадскасці і дзейнічвюць пры мясцовых органах культуры, розных установах, прадпрыемствах, навучальных установах. Знаходзяцца на ўліку ў мясцовых органах культуры і працуюць пад навукова-метадычным кіраўніцтвам дзяржаўных музеяў

2. Правільны адказ – В

3. Правільны адказ: А – 5, Б – 1, В – 2, Г – 2, Д – 1, Е – 1.

4. Правільны адказ: А – 3, Б – 2, В – 1.

5. Правільны адказ: А, В, Б.

Тэст 13.

1. цэнтралізаваная сістэма музеяў, створаная на аснове комплексаў, ансамблей і нерухомых помнікаў, абвешчаных Саветам міністраў у сувязі з іх надзвычайнай каштоўнасцю запаведнай тэрыторыяй

2. Правільны адказ – Г

3.Правільны адказ: А – 1, Б – 3, В – 6, Г – 2, Д – 1, Е – 1.

4. Правільны адказ: А – 1, Б – 3, В – 2.

5. Правільны адказ: В, Б, А.

Тэст 14

1. профільная група музеяў, зборы якіх дэманструюць гісторыю і сучасны стан народнай адукацыі. Гэтыя музеі таксама камплектуюць іатэрыялы па методыке выкладання, праводзяць метадычную работу з настаўнікамі і знаходзяцца ў падпарадкаванні органаў народнай адукацыі
2. Правільны адказ – В
3. Правільны адказ: А – 3, Б – 2, В – 1, Г – 6, Д – 1, Е –1.

4.Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 3.

5. Правільны адказ: А, Б.

Тэст 15

1. музеі, характарызуючыя на комплекс галін тэхнікі, прысвечаныя асбным галінам, а таксама асобным падзея

зборы якіх адлюстроўваюць  і дакуменціруюць развіццё навукі і тэнікі, падзяляюцца м і выдатным асобам

2.Правільны адказ – Б

Правільны адказ: А – 2, Б – 6, В – 3, Г – 1, Д – 5, Е – 1.

3.Правільны адказ: А – 3, Б – 2, В – 1.

5. Правільны адказ: Б, В, А.

Тэст 16

1.профільная група музеяў, зборы якіх уключаюць мастацкія творы і адлюстроўваюць гісторыю развіцця выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Падзяляюцца на музеі шырокага профіля (жывапіс, графіка, скульптура) і музеі аднага з відаў мастацтва, а таксама музеі прысвечаныя выдатным мастакам

2.Правільны адказ – А

3.Правільны адказ: А – 6, Б – 1, В – 3, Г – 2, Д – 5, Е – 1.

4.Правільны адказ: А – 1, Б – 3, В – 2

5. Правільны адказ: Б, А, В.

Тэст 17.

1. гістарычнага профілю, зборы якіх дакументуюць гісторыю, асаблівасці культуры і побыту розных народаў

2. Правільны адказ – В

3.Правільны адказ: А – 3, Б – 1, В – 1, Г – 4, Д – 3, Е – 1.

4.Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 3.

5. Правільны адказ: Б, В, А.

Тэст 18

1. гістарычнага профілю, зборы якіх дакументуюць старажытную і сярэдневековую гісторыю чалавечага грамадства

2. Правільны адказ – Г

3.Правільны адказ: А – 1, Б – 6, В – 3, Г – 4, Д – 1, Е – 1.

4. Правільны адказ: А – 3, Б – 2, В – 1.

5.Правільны адказ: Б, В, А.

Тэст 19

1.створаныя ў памяць аб выдатных падзеях ці асобах і размешчаны на памятных месцах альбо ў памятным будынку

2. Правільны адказ – В

3. Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 2, Г – 1, Д – 2, Е –3.

4. Правільны адказ: А – 1, Б – 3, В – 2.

5. Правільны адказ: В, Б, А.

Тэст 20.

1. зборы якіх дакументіруюць гісторыю развіцця чалавечага грамадства, яны падзяляюцца на агульнагістарычныя, гісторыі асобных установ, прысвечаныя асобным гістарычным дзеячам

2. Правільны адказ – А

3. Правільны адказ: А – 2, Б – 2, В – 1, Г – 3, Д – 1, Е – 2.

3. Правільны адказ: А – 2, Б – 1, В – 3.
4. Правіль адказ: А, Б, В.